**19.** Якая літара ў беларускім алфавіце стаіць перад *ў*?

**А)** х. **Б)** ц. **В)** у. **Г)** ф. **Д)** ы.

**20.** Прачытайце ўважліва верш Я. Коласа “На лузе”. Колькі [о] у словах твора?

*Ветрык краскі чуць калыша,*
*Травы шалясцяць.*
*Луг зялёны жыццём дыша,*
*Конікі трашчаць.*

*У лозах шчэбет не сціхае,*
*Шум стаіць і свіст.*
*У яркім бляску спачывае*
*На ракіце ліст.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**21.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску неабходна напісаць мяккі знак?

*1) іл..дзіна; 2) дз..веры; 3) ц..мянасць; 4) узмор..е.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3.
**Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**22.** Вызначце правільны запіс прыметніка ў словазлучэнні.

*1) феірычнае відовішча; 2) фіерычнае відовішча; 3) фіярычнае відовішча; 4) феярычнае відовішча; 5) феерычнае відовішча.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**23.** Як называліся ў народзе песні, што спяваліся падчас гукання вясны?

*1) забаўлянкі; 2) пацешкі; 3) вяснянкі; 4) гулянкі; 5) песенькі.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**24.** Старажытныя беларускія гарады былі буйнымі цэнтрамі рамяства. Археолагі падлічылі, што ў Полацку, напрыклад, жылі майстры больш чым шасцідзесяці спецыяльнасцей: ганчары, бондары, шаўцы, меднікі і інш. Як называўся майстар, які рабіў грабяні, гузікі, шахматныя фігуры?

*1) замочнік; 2) збройнік; 3) гарбар; 4) жарнасек; 5) касцярэз.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/
ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 28500 экз. г. Мінск. 2016 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2016»

*Чацвер, 18 лютага 2016 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі В. Гардзея. Колькі слоў ужыта ў творы, якія маюць толькі тры склады?

*Дарогі, гасцінцы, сцяжыны*
*На захад бягуць і на ўсход.*
*І ўсюды прасторы Айчыны,*
*І ўсюды жыве мой народ.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**2.** Адзначце правільны адпаведнік у беларускай мове рускага слова *деревня*.

**А)** сяло. **Б)** засценак. **В)** пасёлак. **Г)** дзярэўня. **Д)** вёска.

**3.** Падлічыце, колькі слоў у дадзеным сказе.

*Надціхіміпаляміўстаезалацістаязара.*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**4.** Пра каго расказаў М. Пазнякоў у вершаваных радках?

*Працаўніца шчыравала,*
*Мех арэхаў назбірала.*
*І грыбоў шмат насушыла,*
*Спелых шышак нанасіла.*
*Пахавала ўсё ў дупло,*
*Каб зімой на стол было.*

**А)** пра куніцу. **Б)** пра лісу. **В)** пра выдру.
**Г)** пра вавёрку. **Д)** пра мыш.

**5.** Маша, Янка і Антось атрымалі заданне выпісаць словы, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***з***.

Маша выпісала словы *сувязь, прозьба, звузіць*.
Янка – *завязь, казьба, збіраць*.
Антось – *дробязь, разьба, збегчы*.

Хто з вучняў правільна выканаў усё заданне?
**А)** усе вучні. **Б)** Маша і Янка. **В)** Маша. **Г)** Янка. **Д)** Антось.

**6.** Падлічыце, колькі назоўнікаў у сказе.
*Вада ў рэчцы была халодная, як лёд, і чыстая, як раса.*
**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**7.** Знайдзіце “лішняе” слова ў радзе:
*спявак, шпак, мастак, паэт.*
**А)** няма “лішняга” слова. **Б)** спявак. **В)** шпак. **Г)** мастак. **Д)** паэт.

**8.** У народзе здаўна існуе прыкмета надвор’я:
*Рыбы выскакваюць з вады і ловяць мошак – на … .*
**А)** мароз. **Б)** дождж. **В)** сонца. **Г)** добры ўлоў. **Д)** ураджай.

**9**. Адгадайце вершаваную загадку М. Маляўкі, узнавіўшы з “рассыпаных” складоў слова-адгадку.

*Блакітнае акно,*
*Пакажа ўсё яно.*
*Захочаш – калі ласка,*
*Табе пакажа казку.*

**А)** ё, ды, ра. **Б)** зар, тэ, ві, ле. **В)** га, кні.
**Г)** атр, тэ, на, кі. **Д)** ча, ле, да, ра, тэ, пе.

**10.** Вызначце, якое слова не з’яўляецца гароднінай:
*морква, парэчкі, радыска, гарбуз.*
**А)** няма патрэбнага варыянта. **Б)** морква. **В)** парэчкі.
**Г)** радыска. **Д)** гарбуз.

**11.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Янкі Журбы.

*Бор сустрэў нас, як сяброў,*
*Даў па кошыку грыбоў:*
*Сыраежак, маслякоў,*
*І апенек, і груздоў,*
*І лісічак, і рыжкоў,*
*А найбольш – баравікоў.*

Падлічыце, колькі назваў грыбоў ужыта ў творы.
**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**12.** Колькі агульных назоўнікаў можна скласці са складоў *ка, за, ва, са*?
**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**13.** Дадзены прыметнікі *бáцькаў, бáцькаўскі, бацькóўскі*. Якое слова мае значэнне *‘звязаны з бацькаўшчынай, радзімай’*?
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбнага варыянта. **В)** бáцькаў.
**Г)** бáцькаўскі. **Д)** бацькóўскі.

**14.** Выберыце з дадзеных слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***о***:
*1) к..рова; 2) ж..луд; 3) р..жок.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2. **Д)** 3.

**15.** Якія словы з дадзеных правільна падзелены для пераносу?
*1) птуш-ка; 2) раскры-ць; 3) дзяцін-ства.*
**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2.
**Г)** 2, 3. **Д)** 1, 3.

**16.** Колькі назоўнікаў у форме назоўнага склону ўжыта ў вершаваных радках В. Вярбы?

*Белыя бярозы спалі на ўзлеску,*
*А сваю галоўку ўзняла пралеска.*
*Тоненькую ножку з-пад пярыны белай*
*На зямлю пралеска ставіла нясмела.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 8.

**17.** Пасля якіх літар у словах не пішацца апостраф?
*1) й; 2) д; 3) ў; 4) б.*
**А)** пасля ўсіх дадзеных літар. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**18.** *Разынкі* – гэта сушаныя ягады … .
**А)** ажын. **Б)** трускалак. **В)** вішань. **Г)** вінаграду. **Д)** журавін.